**М. Г. Цапкевіч,**
настаўніца пачатковых класаў
Капцёўскай СШ Гродзенскага раёна

**Тэма:** Падарожжа з “Вясёлкай”

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з гісторыяй стварэння часопіса; узнавіць слоўнікавы запас, развіваць цікавасць і мову вучняў; выхоўваць любоў да сваёй Радзімы і роднай мовы.

**Абсталяванне:** мультымедыа, часопісы “Вясёлка”, кніга “Вясёлка”, малюнак цягнічка, запіс гука цягніка, маскі індыка і гусі, глобус, карта, выстава кніг.

**Форма правядзення:** завочнае падарожжа

## Ход выхаваўчай гадзіны

**Настаўнік.** Добры дзень, шаноўныя! Сёння мы з вамі адправімся ў падарожжа. Мы будзем падарожнічаць на цягніку. Ці вандравалі вы калі-небудзь на такім відзе транспарту?
А каб не сумаваць у дарозе, возьмем з сабою Вясёлку. І так, у добры шлях!

**(гук цягніка)**

**Настаўнік.** Наш цягнік прыбывае на станцыю «Гістарычная».

**(вывешваецца на дошку назва станцыі)**
**Настаўнік.** «Вясёлка» – гэта самы першы беларускі часопіс для дзяцей.
Успомніце, калі быў надрукаваны самы першы нумар часопіса? (у красавіку 1957 года)
У гэтым годзе часопісу споўніцца 57 гадоў. А выглядаў ён так.

**(паказваецца вокладка першага нумара)**
**Настаўнік.** Першы нумар нарадзіўся вельмі даўно, калі не было на свеце ні мяне, ні вас, ні вашых бацькоў, а дзядулі і бабулі былі меншыя за вас.
Успомніце, хто быў галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса? (Васіль Вітка)

**(паказваецца партрэт)**
**Настаўнік.** Вучань падрыхтаваў паведамленне пра жыцце і творчы шлях Васіля Віткі.

**Вучань.** Нарадзіўся Васіль Вітка 16 мая 1911 года ў вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Сапраўднае імя - Крысько Цімох Васільевіч. Скончыўшы школу ў Слуцку, працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце.

Друкавацца пачаў у 1928 годзе. Першы зборнік вершаў «Гартаванне» быў выдадзены ў 1944 годзе ў Маскве. У 1957-1974 гг. - галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка».

У 1978 годзе Васіль Вітка быў узнагароджаны Міжнародным ганаровым дыпломам імя Х. К. Андэрсена з занясеннем прозвішча пісьменніка ў ганаровы спіс вялікага дацкага казачніка. За творчую дзейнасць узнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй БССР, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума - «Знак Пашаны» і медалямі.

**Настаўнік.** Вясёлка – гэта сонечная ўсмешка прыроды ў блакітным, чыстым пасля дажджу небе.

Як вы думаеце, чаму В. Вітка прыдумаў часопісу такую назву? (Рознакаляровы, вясёлы)
Чым падабаецца вам часопіс?

Мы Вясёлачку чытаем:
Вершы дзеда Васіля,
Казкі пра вавёрку, зая,
Генерала – вераб'я.

**Настаўнік.** Васіль Вітка, а дзеці называлі яго дзед Васіль, напісаў многа казак для дзяцей. Ён нават стварыў сваю «ППШ».

Наш цягнік адпраўляецца на <u>станцыю «ППШ».</u>

**(гук цягніка)**

**Настаўнік.** Можа хто-небудзь ведае, что за ППШ стварыў В. Вітка?
(«Птушыная пачатковая школа»)
У птушынай пачатковай школе былі незвычайныя вучні. Здагадайцеся, якія вучні там былі? Птушкі так, як і дзеці, бываюць вучнямі старанныммі і руплівымі, а бываюць і наадварот – лянівымі.
Сёння да нас прыйшлі вучні Птушынай пачатковай школы – індык і гусь.

Настаўнік. Ён старацца не прывык
Ні лічыць, ні пісаць.
І не знае: 5+5,
Толькі ўмее балбатаць:
Індык. Блу-блу-блу,
Блу-блу-блу –
Вельмі ж я чытаць
Луб-лу.

**Настаўнік.** Вучні «ППШ» па-свойму, па-птушынаму, авалодваюць ведамі:

**Настаўнік.** Дзюбаю вадзіла гусь
І па карце лазіла.

Усё шукала Беларусь
У Афрыцы і Азіі.
Так шукала ўпарта –
Выдзеўбла ўсю карту.

**Настаўнік.** А вы добра ведаеце Беларусь?
Назавіце сталіцу Беларусі.
Колькі абласцей у нашай Рэспубліцы?
Назавіце плошчу Беларусі? (207 600 км$^2$)
Колькі насельніцтва пражывае ў нас па апошнім звесткам перапісу?
(9 міл. 463 тыс.)

Добрыя вы ў мяне вучні, не такія, як у птушынай школе.
Але давайце хуценька па вагонах, едзем далей. На наступнай станцыі нас чакае Алена Валянцінаўна, наш школьны бібліятэкар.

**(гук цягніка)**

**Фізкультхвілінка**

**Бібліятэкар.** Вітаю вас, паважаныя сябры, на станцыі «Юбілейная».
Ці ведаеце вы, чаму так называецца станцыя? (Адказы дзяцей)

**(расказваецца, чаму станцыя называецца «Юбілейная»)**
**Настаўнік.** Ці ведаеце вы, хто з'яўляецца галоўным рэдактарам сёння?
(Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі)
Назавіце рэдакцыйную калегію.

**Настаўнік.** Мы ведаем галоўнага рэдактара і рэдакцыйную калегію, правялі цікавы «Урок «Вясёлкі», склалі верш і разам з фотаздымкам паслалі ў рэдакцыю. Праз некалькі дзён мы атрымалі ліст ад галоўнага рэдактара і рэдакцыйнай калегіі.

**(чытаецца ліст)**
**Бібліятэкар.** У будынку Нацыянальнай бібліятэкі г. Мінска адбылося свята 55-годдзя «Вясёлкі». Часопіс запрасіў усіх сваіх сяброў, а на памяць для гасцей падарыў вось такія цудоўныя кнігі.

**(паказваецца кніга і расказваецца аб ёй)**
**Настаўнік.** Многа цікавага мы даведаліся на гэтай станцыі, але нам пара ў дарогу.

**(гук цягніка)**

**Настаўнік.** Мы з вамі прыбылі на станцыю “Хвілінка-весялінка”.
У вас на стале ёсць часопіс.Трэба адгадаць рэбус, які нам прапануецца.

**(работа па групах)**

**Настаўнік.** А яшчэ вам трэба разгадаць крыжаванку і назву станцыі, на якую мы адправімся.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | б | у | с | е | л | | | |
| | | в | е | р | а | с | е | н | ь | |
| | в | у | л | е | й | | | | | |
| | | в | а | з | а | | | | | |
| | Н | а | р | а | ч | | | | | |
| п | а | в | у | к | | | | | | |
| | в | я | с | н | а | | | | | |
| г | у | с | ь | | | | | | | |

1. Птушка – сімвал нашай Радзімы.
2. Месяц, калі пачынаюцца заняткі ў школе.
3. Домік, у якім жывуць пчолы.
4. Пасудзіна для кветак.
5. Назва возера.
6. Сам малы, але спрытна пляце вялікія сеці.
7. Пара года паміж зімой і летам.
8. У вадзе купалася, сухой засталася.

**Настаўнік.** Наступная станцыя “Родны кут”

**(гук цягніка)**

**Настаўнік.** На станцыі вучні нашага класа падрыхтавалі вершы аб Радзіме беларускіх паэтаў, якія друкаваліся ў часопісе “Вясёлка”.

**Станцыя “Бабулін куфэрак” (загадкі)**

**Настаўнік**. Ці спадабалася вам наша падарожжа?
Што вам больш запомнілася?
На гэтым наша падарожжа не канчаецца. Мы з вамі выпісваем “Вясёлку”, а кожны яе нумар - новае падарожжа па нязведаных намі прасторах.

Настаўнік. Беларускі наш часопіс
Вельмі любім мы чытаць,
Каб вучыцца ўсім старанна
На мове роднай размаўляць.
Новы нумар твой вясёлы
Імчыцца ў Капцёўскую школу.

# «ГІСТАРЫЧНАЯ»

# «ППШ»

# «РОДНАЕ СЛОВА»

# «ЮБІЛЕЙНАЯ»

# «БАБУЛІН КУФЭРАК»

# «ХВІЛІНКА-ВЕСЯЛІНКА»